Навейшая паэтычная думка кранае і такія новыя аспекты Ефрасіннеўскага жыцця, як смерць (верш Алены Мігаль "Багіня полацкіх званоў"). Традыцыйная для хрысціянскай літаратуры тэма смерці, не вымаўляльная ("смерці няма, таварышы") у савецкі перыяд, адраджаецца, як адраджаецца і новае разуменне часу ў канцы XX — пачатку XXI ст.

1. *Руднев В.* Энциклопедический словарь культуры XX века. — М., 2001. — 608 с.

2. *Бондар Т.* Спадчынны боль. Паэзія. — Мн., 1987. — 150 с.

3. *Элиаде Мирча.* Аспекты мифа. — М., 2000. — 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**І.А.Малахава,**
*дацэнт*

## МУЗЫКА І ТЭАТР ЯК ФАКТАРЫ РАЗВІЦЦЯ КРЭАТЫЎНАСЦІ АСОБЫ

Перабудова сістэмы адукацыі, разгорнутая ў нашай краіне ў апошнія гады, мае на мэце выхаванне духоўнасці, міласэрнасці, гуманізму, фарміраванне творчых адносін да жыцця, развіццё крэатыўнасці кожнага ўдзельніка адукацыйнай прасторы. Таму неабходна высветліць магчымыя сродкі, фактары і ўмовы эфектыўнасці гэтых працэсаў з тым, каб карыстацца найбольш адпаведнымі сучаснаму стану. Мастацтва ў гэтым сэнсе можа заняць дамінуючую пазіцыю, паколькі ва ўсёй разнастайнасці формаў, жанраў і відаў дае магчымасць інтэнсіфікацыі крэатыўных працэсаў чалавека, дапамагае фарміраванню эмацыянальнай і духоўнай культуры асобы.

Сучасныя даследчыкі творчага развіцця сродкамі мастацтва прызнаюць існаванне менавіта пяці асноўных яго відаў: літаратура, кіно, музыка, тэатр, выяўленчае мастацтва. Аднак у тэорыі мастацкай творчасці распаўсюджаны пункт гледжання (Л.Выгоцкі), адпаведна якому розныя віды мастацтва неаднолькава ўздейнічаюць на дзіця ў той ці іншы ўзроставы перыяд. Таму даследчыкі папярэджваюць, што, развіваючы пераважную цікавасць да якога-небудзь аднаго віду мастацтва, неабходна клапаціцца аб тым, каб пастаянна ўзбагачаць сябе ўражаннямі ва ўсіх астатніх яго відах.

Яшчэ вялікія мысліцелі мінуўшчыны Платон і Арыстоцель пісалі аб выхаваўчай сіле музыкі. "Няма сумнення, — сцвярджаў Арыстоцель, — што толькі актыўныя заняткі музыкай могуць мець сапраўднае выхаваўчае значэнне, а калі так, то музыка абавязкова павінна ўваходзіць у праграму навучання" [1, с. 207].

Суѓучна гэтаму выказванне Платона: "Калі чалавек не музыкант, то ён не можа быць настаўнікам" [2, с. 301]. Значыць, з усіх вучэбных дысцыплін адзінай, па-сапраўднаму выхаваўчай з'яўляецца музыка, паколькі яна не толькі трэніруе мозг, але развівае і робіць высакароднымі пачуцці. Аб сіле музычнага ўздзеяння ў свой час пісаў А.Блок: "Музыка — вышэйшая каштоўнасць, якая не патрабуе для сваёй абумоўленасці спасылак на якія-небудзь больш высокія каштоўнасці, паколькі такіх проста няма; спачатку была музыка". Гімн музыцы гучыць у выказваннях і іншых дзеячаў мастацтва. "У кожным творы мастацтва... ёсць схаваная музыка. І гэта не толькі таму, што ёй абавязкова належаць рытм і ўнутраны рух, але сама душа мастацтва музычная", — пісаў В.Іваноў [3, с. 115].

Уздзейнічаючы на орган слыху, музычныя гукі выклікаюць пачуцці і перажыванні, ствараюць адпаведны настрой. Значыць, музыка ўзбуджае свет пачуццяў, са-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічае выпрацоўцы выразнага светапогляду. Паводле азначэння А.Бальзака, музыка выклікае пачуцці і думкі ў іх цэласнай формс. У кнізе “Аб мастацтве фартэпіяннай ігры” таленавіты музыкант і педагог Г.Нейгаўз [5] пісаў: «Музыка жыве ўнутры нас, у нашым мазгу, у нашай свядомасці, пачуццях, уяўленні, яе “месца жыхарства” можна дакладна вызначыць: гэта наш слых; інструмент існуе паза намі, гэта частка аб’ектыўнага свету, якую трэба пазнаць, каб падпарадкаваць яе нашаму ўнутранаму свету, нашай творчай волі». І, вывучаючы сутнасць музыкі і выканаўства, ён працягвае: «Адным з маіх галоўных патрабаванняў для дасягнення мастацкай прыгажосці выканання з’яўляецца патрабаванне прыгажосці і натуральнасці выказвання. Усё нявыказанае... што пастаянна жыве ў душы чалавека, усё “падсвядомае” і ёсць царства музыкі. Тут яе вытокі» [5, с. 49].

Асабліва актуальнае музычнае выхаванне ў дзіцячым і падлеткавым узросце, паколькі прыносіць дзецям унутранае заспакаенне. Музыка — гэта радасць дзейнасці, актыўнага далучэння да творчага працэсу. На думку Р.Слэка, музыка перш за ўсё выхоўвае музычную дысцыпліну, імкненне да дасканаласці індывідуальнага і калектыўнага выканання, дасканаласці, якую прыносіць вялікае эмацыянальнае задавальненне.

Акрамя таго, з дапамогай музыкі стымулюецца разумовае развіццё дзіцяці, музыка з’яўляецца каталізатарам эмоцый і пачуццяў, без чаго немагчыма дасягненне поўнай сталасці. На думку В.Сухамлінскага, музычнае выхаванне — гэта не выхаванне музыканта, а перш за ўсё выхаванне чалавека. Аб выхаваўчай сіле музыкі Д.Кабалеўскі пісаў, што таксама, як літаратура і выяўленчае мастацтва, музыка рашуча ўмешваецца ва ўсе сферы выхавання і адукацыі нашых дзяцей, з’яўляецца магутным і незаменным сродкам фарміравання духоўнага свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, каштоўнасць музычнага выхавання дзяцей і падлеткаў заключаецца ў тым, што музыка выступае як сродак: 1) самавыяўлення; 2) выражэння эмоцый і пачуццяў; 3) развіцця мастацкай культуры і інтэлекту; 4) рэалізацыі крэатыўнасці; 5) поліфункцыянальнага прызначэння; 6) узаемаразумення паміж людзьмі. Адна з галоўных задач музычнага выхавання — развіццё творчых якасцей асобы — будзе паспяхова вырашана, калі ў аснове музычнага ўздзеяння на ўсіх этапах навучання стане галоўны прынцып, які вызначыў развіццё чалавецтва, — творчасць.

Вядомы рэжысёр і педагог К.С. Станіслаўскі пісаў, што творчасць ёсць перш за ўсё поўная сканцэнтраванасць духоўнай і фізічнай прыроды. Яна захапляе не толькі зрок і слых, але і ўсе пяць пачуццяў чалавека, яна захапляе, акрамя таго, і цела, і душу, і розум, і волю, і пачуцці, і памяць, і ўяўленне. Сапраўдная творчасць, у тым ліку і музычнае выкананне, ёсць заўсёды споведзь мастака.

Актуальна гучаць думкі Г.Нейгаўза аб музычнай творчасці: «Перш чым навучыцца іграць на якім бы то ні было інструменце, навучэнец — дзіця, падлетак ці дарослы — павінен ужо духоўна валодаць якой-небудзь музыкай, захоўваць яе ў сваёй свядомасці, насіць у душы і чуць сваім слыхам. Увесь сакрэт таленту ці генія складаецца з таго, што ў яго розуме ўжо жыве поўным жыццём музыка раней, чым ён першы раз дакранецца да клавішы або правядзе смычком па струне. Вось чаму маленькі Моцарт “адразу” зайграў на фартэпіяна і скрыпцы» [5, с. 56]. Аўтар зазначае, што ўсякае выкананне складаецца з трох асноўных элементаў: музыкі, выканаўцы і інструмента, з дапамогай якога ажыццяўляецца выкананне. Толькі поўнае авалоданне гэтымі трыма элементамі (у першую чаргу музыкай) можа забяспечыць добрае мастацкае выкананне. Для таго каб гаварыць і мець права быць пачу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым, трэба не толькі ўмець гаварыць, але і мець што сказаць.

Праблема развіцця творчых якасцей асобы, рэалізацыі крэатыўнасці можа быць вырашана паспяхова пры ўмове ўзаемадзеяння музычнай мовы з іншымі відамі мастацтва ў адзіным арганізме, якім, на наш погляд, з'яўляецца музычны тэатр.

Магчымасці тэатра як мастацкага сродку выхавання здаўна прыцягвалі ўвагу дзеячаў культуры, адукацыі, даследчыкаў. І гэта не выпадкова, таму што тэатральнае мастацтва ва ўсім мностве сваіх сродкаў і формаў аказвае вялікі ўплыў на свядомасць, пачуцці, густы, фарміраванне эстэтычных адносін да рэчаіснасці, развіццё творчых якасцей асобы. Тэатр — мастацтва сінтэтычнае, адначасова ўплывае на гледачоў словам, дзеяннем і пластыкай акцёра, колерам, святлом, музыкай, выяўленча-выразным вырашэннем прасторы і іншымі сродкамі. Гэта магчымасць шматбаковага ўздзеяння тэатральнага мастацтва, падмацаваная непасрэднасцю кантактаў паміж стваральнікамі і гледачамі, калектыўнасцю творчага працэсу, належыць да галоўных спецыфічных рыс тэатральнай творчасці як сродку выхавання.

Сярод іншых відаў тэатральнай творчасці асобае месца, на наш погляд, займае музычны тэатр, дзе два асноўных мастацтвы (музыка і тэатр) аб'ядноўваюцца ў адзіны арганізм, ствараюць магутны сродак развіцця творчых якасцей асобы, асаблівасці ўздзеяння якога яшчэ мала вывучаны. Паколькі і музыка, і тэатр з'яўляюцца дзейснымі сродкамі выхавання, то арганічнае спляценне іх з іншымі відамі мастацтва ў адзіны арганізм даволі эфектыўна актывізуе творчы патэнцыял дзіцяці, развівае ўяўленні і фантазію. Музычны тэатр, з'яўляючыся сінтэтычным відам творчай дзейнасці, дзе займальны сюжэт, сцэнічная мова, мастацкае афармленне падпарадка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваны галоўнаму — музыцы, адчыняе вялікія магчымасці для развіцця крэатыўнасці.

Асаблівасці музычнага тэатра як жанру тэатральнага мастацтва вельмі дакладна адлюстраваны ва ўспамінах стваральніцы першага дзіцячага музычнага тэатра Н.Сац, якая лічыць, што тэатр сваім жывым дзеяннем, вобразнасцю, яскравымі фарбамі дапаможа наблізіць дзяцей да музыкі, якая гучыць на сцэне, у аркестры, а музыка надасць яшчэ большую глыбіню ідэям спектакля, яшчэ большую эмацыянальнасць успрыманню кожнай дзеючай асобы, дакажа тое, што не заўсёды можна сказаць словамі.

Такім чынам, музычны тэатр з’яўляецца адной з самых дасканалых формаў сінтэтычнага мастацтва, дзе абагульняюцца многія бакі жыцця, разнастайнасць народных традыцый, ступень нацыянальнай самасвядомасці, узровень духоўнай культуры. Менавіта сінтэтычная прырода музычнага тэатра дазваляе гаварыць аб яго універсальных выхаваўчых магчымасцях, таму што прыцягненне дзіцяці адразу да некалькіх відаў мастацкай творчасці садзейнічае найбольш поўнаму развіццю крэатыўнасці, праяўленню шматграннасці і непаўторнасці таленту.

1. *Аристотель.* Политика // Соч.: В 4 т. — М.: Мысль, 1983. — Т.4.

2. *Платон.* Диалоги. — М.: Мысль, 1986.

3.*Иванов Вяч.* По звёздам // Музыка как вид искусства. — М., 1991. — Ч.2. — С. 115—123.

4.*Шпет Г.* Эстетические фрагменты. — СПб., 1922. — Вып. 1.

5. *Нейгауз Г.Г.* Об искусстве фортепианной игры: Записки педагога. — 5-е изд. — М.: Музыка, 1988.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ